Міхала Казіміра *Агінскага* ў г. Слонім. Засн. да 1771, спыніў дзейнасць пасля 1791. У тэатры працавалі прафесійныя італьян., ням., польскія спевакі, прыгонны хор і балет. Балетная трупа падрыхтавана ў *Слонімскай балетнай школе.* Паказы суправаджала Слонімская капэла Агінскага. У 1770—80-я гады пры тэатры існавала муз. школа. Рэпертуар тэатра складаўся з балетаў, у т.л. «Каралеўскі балет», «Балет млынароў», «Дзікі балет» і «Дэзерцір» (апошнія 2 паказаны ў 1790—91 на гастролях у г. Дубна, цяпер Украіна); опер італьян. кампазітараў Дж.Паізіела, Э.Дуні, А.Грэтры, П.Мансіны, Н.Іамелі, А.Сакіні, П.Гульельмі, К.В.Глюка, Дж.Таэскі («Тэлемак», 1780) і інш., а таксама Агінскага («Зменены філосаф», 1771; «Елісейскія палі», 1788); трагедый Вальтэра («Альзіра», 1780, 1783; «Мар'яна», 1786) і інш. Паводле «Інвентара інструментаў і музычных папер» (складзены ў 1801, перакаменціраваны А.Цеханавецкім) збор нот твораў, што выконваліся на розных сцэнах т-ра Агінскага, уключаў 60 опер, 18 балетаў, 3 муз. камедыі, 253 сімфоніі і больш за 460 інш. муз. твораў (араторыі, арыі, музыка для дывертысментаў, асобных танцаў і інш.). Сярод выканаўцаў дачка «мэтра ігры на клавікордзе» Д.Грабенбаўэра, Г.Давіа, П.Драздоўская, Лісевічаўна, Канапкоўна, Кінтнер, Герман, Пленц, Марцінкевічаўна, Шуцкая, Міхайлоўская, Цэльнер, салісты Янскі і М.Лазарыні. Філіялы тэатра працавалі ў г. Седльц (Польшча) і мяст. Целяханы (Івацэвіцкі р-н). У 1771 функцыянаваў «плывучы тэатр» на баржах на Агінскім канале. Паміж 1777—80 пабудаваны «Дом оперы» (арх. І.Мараіна, разбураны пасля 1804), які меў вял. сцэну, прыстасаваную для паказаў любых барочных спектакляў, опер і балетаў, для выхаду вял. колькасці спевакоў і статыстаў, для тэатр. баталій коннікаў і водных феерый (частка сцэны затаплялася вадой з канала і па ёй плавалі лодкі), для складаных перспектыў і дэкарацый, розных сцэнічных эфектаў. Тэхн. магчымасці сцэны дазвалялі паказаць і 2 фантаны, якія асвятляліся бенгальскімі агнямі (пры тэатры быў спец. піратэхнік — «майстар па феерверках» Ц.Г.Ваксмунт). Дэкарацыі для тэатра стварыалі Мараіна і тэатр. машыніст Жан Баі (у дакументах праходзіў пад імем Ян Бой). Сярод інш. мастакоў тэатра: К.Атасельскі, Штроўбл (працаваў да 1777), І.Рэгер (1776—78), Ян Рустэм (1788—90), А.С.Дамброўскі і прыгонныя майстры-дэкаратары Міхал, Мікалай, Янак.

*Літ.:* Барышаў Г.І. Слонімскі тэатр М.Агінскага // Гісторыя беларускага тэатра. Т.1. Мн., 1983; Яго ж. Слонімскі унікум // Тэатр. Мінск. 1984. № 6; Цеханавецкі А. Міхал Казімір Агінскі і яго «сядзіба музаў» у Слоніме: Пер. з ням. Мн., 1993.

**СЛО́НІМСКІ ШКО́ЛЬНЫ ТЭА́ТР**. Існаваў у 1744—69 у г. Слонім пры езуіцкім калегіуме. У рэпертуары пераважалі драмы на рэліг., міфалагічныя і гіст. сюжэты. Паказы адбываліся пераважна на лац., зрэдку на польскай мовах; звычайна яны суправаджаліся алегарычным пралогам, эпілогам, харамі, інтэрмедыямі і найчасцей прымяркоўваліся да пастоў, завяршэння навуч. года, некат. свят. Аўтарамі былі выкладчыкі калегіума, у спектаклях удзельнічалі і выкладчыкі, і навучэнцы. Захаваліся звесткі пра 4 пастаўленыя ў Слоніме п'есы: масленічная драма «Імгненне няшчаснай вечнасці» Ф.Навадворскага, дыдактычная драма «Кветка з надпісам імёнаў цароў» (абедзве 1744), «Задумы з галавы Палады» (1749), драма «Аляксей» (1769), прымеркаваная да імянін мецэната тэатра гетмана М.К.Агінскага, якая потым была выдадзена асобнай кніжкай на польскай мове.

*Літ.:* Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. Мн., 1983. С. 142.

*І.А.Алексніна.*

**СЛУЦК. Тэатральнае і музычнае жыццё**. С. — горад абл. падпарадкавання ў Мінскай вобл. З 16 ст. на Случчыне існавала батлейка, ставіліся сцэны рэліг. і камед. характару. У канцы 19 — пач. 20 ст. батлеечныя сцэны выконваліся людзьмі — т.зв. жывая батлейка. У 1963 у в. Бялевічы аматары паказалі нар. драму «Цар Максімілян» з захаваннем даўніх традыцый. У пач. 17 ст. ў кальвініцкай гімназіі вучнямі пад кіраўніцтвам настаўнікаў пастаўлены першыя спектаклі (камедыі). У 1715—36 пры езуіцкім калегіуме існаваў школьны тэатр. Захаваліся друкаваныя праграмы драм на лац. мове — «Ваенная доблесць, што з'явілася ад навукі» і «Пасол». У 1751—60 у С. дзейнічаў *Слуцкі тэатр Радзівіла*, паказы якога суправаджала капэла (прыдворны аркестр, 1746—60), працавалі таксама *Слуцкая балетная школа,* муз. школа, якая рыхтавала музыкантаў для капэлы. У пач. 20 ст. дзейнічаў аматарскі муз.-драм. гурток. У 1911 выступала прафес. бел. трупа І.Буйніцкага. У 1917—20 драм. паказы ў С. і навакольных вёсках ладзіла культ.-асв. арганізацыя «*Папараць-кветка*». З 1919 пры клубе працаваў аматарскі тэатр. гурток. У рэпертуары пераважала класіка: «Без віны вінаватыя» і «На бойкім месцы» А.Астроўскага, «На дне» М.Горкага і інш. У 1936—41 дзейнічаў *Слуцкі калгасна-саўгасны тэатр.* У С. працуюць: *Слуцкі народны тэ-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ